# ІНТЭЛЕГЕНТ З НАРОДА

*Рогач П.І.*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт,
Мінск
E-mail: pavel_rogatch@yahoo.com

Мне шанцавала ў жыцці на добрых людзей, якія аказалі вялікі уплыў на фарміраваанне майго светапогляду. Сярод іх на першае месца я паставіў бы Івана Іванавіча Трухана.

Упершыню я пазнаёміўся з ім далёкім 1958 г.Я працаваў тады на шахце №6 у г. Кохтла-Ярве, што знаходзіцца ў Эстоніі. Меў на той час працоўны стаж каля двух гадоў, што давала перавагі пры паступленні ў ВНУ. Паслаў і я заяву ў БДУ з просьбай дапусціць мяне да здачы экзаменаў на гісторыка-геаграфічны факультэт. Ведаў, што ў Беларусі маецца ўніверсітэт, але якія там факультэты не меў уяўлення. Проста мне хацелася стаць ці гісторыкам, ці географам. Атрымаўшы такую заяву другія б проста адмахнуліся ад яе. Ну што гэта за абітурыент, які нават не ведае, якія факультэты маюцца ва ўніверсітэце. На маё шчасце адказным сакратаром прыёмнай камісіі аказаўся І.І. Трухан. У хуткім часе я атрымаў ліст, дзе мне прапанавалася ўдакладніць факультэт. Пад лістом стаяў подпіс І.І.Трухан. Спешна прыехаўшы ў Мінск, я зайшаў да адказнага сакратара прыёмнай камісіі і пасля размовы з ім вырашыў паступаць на геаграфічны факультэт. Я тады не ведаў, што Іван Іванавіч працуе на гэтым факультэце і што ён так многа зробіць для мяне. З факультэтам я не памыліўся.

Іспыты па геаграфіі прымаў І.І. Трухан і В.Я. Крышчановіч і паставілі мне пяцёрку. Наогул, я здаў усе пяць эказаменаў на добра і выдатна і быў залічаны на геаграфічны факультэт і прызначаны старастам патока. Першы год вучобы я мала сутыкаўся па вучобе і быце з Іванам Іванавічам, паколькі ён быў сакратаром партыйнай арганізацыі факультэта, а прадметы, якія ён выкладаў, былі на старэйшых курсах.

Але ўжо у 1959 г., калі І.І.Трухана прызначылі дэканам геаграфічнага факультэта, я кожны дзень, акрамя выхадных, сустракаўся.з ім. Заходзячы кожную раніцу па журнал бачыў, што дэкан ужо на месцы. Ён ніколі не спазняўся на працу і патрабаваў, каб і выкладчыкі праяўлялі дысцыплінаванасць. Так, ён любіў парадак і дысцыпліну і сам быў прыкладам. Але я ніколі не чуў, каб І.І. Трухан павысіў голас на студэнта, ці выкладчыка. Яго словы былі спакойныя, але ўзважлівыя, і гэта адчувалі ўсе, хто з ім працаваў.

Іван Іванавіч, нягледзячы на сваю занятасць, заўсёды знаходзіў хвілінку, каб распытаць у мяне пра вучобу на патоку, дзе я быў старастам пяць гадоў, пра дысцыпліну і пра праблемы, якія узнікаюць у студэнтаў. І калі патрэбна было яго ўмяшанне, ён гэта рабіў своечасова.

Іван Іванавіч выельмі не любіў студэнтаў, якія парушалі дысцыпліну, ці не праяўлялі асаблівай цікавасці да вучобы. Да іх ён быў бязлітасны. Але калі ён бачыў, што студэнт стараецца, паводзіць сябе прыстойна, то ён дапамангаў як мог такім студэнтам. У той час для студэтаў геаграфічнага факультэта былі ўведзены такія прадметы як фізіка, неарганічная хімія і матэматыка. Безўмоўна, што многія студэны не змаглі належным чынам іх здаць у чарговую сесію. У той час атрымаць тройку на экзамене было раўназначна таму, што студэнт траціць права на атрыманне стыпендыі. Але гэта ўлічываў заўсёды Іван Іванавіч, бо ён добра ведаў, што для многіх студэнтаў у той час стыпедыя была асноўнай крыніцай для жыцця і вучобы. І ён дабіваўся для студэнтаў, якія праяўлялі дысцыплінаванась і цягу да вучобы стыпендыі, ці грашовай дапамогі.

На трэццім курсе, хаця я быў у групе эканом-географаў, Іван Іванавіч накіраваў мяне і яшчэ некалькіх хлопцаў у геалагічную экспедыцыю. "А як жа будзе з нашай вытворчай практыкай, - спыталі мы у яго. "Вось што хлопцы,- адказаў Іван Іванавіч. - Вы папрацуеце два месяцы у геалагічнай партыі, а потым застанецеся ў нейкі раёне, зойдзіце ў аддзел статыстыкі райваканкама, збярэце там матэрыял для справаздачы. Ён паслаў у экспедыцыю тых студэнтаў, якія не мелі аніякай матэрыяльнай падтрымкі з дому.

Дзякуючы Івану Іванавічу мне на трэццім курсе была прызначана і Ленінская стыпедыя.

На чацвёртым курсе Іван Іванавіч пачаў чытаць нам частку курса "Эканамічная геаграфія СССР". Гэта быў прыроджаны лектар. Яго лекцыі адрозніваліся ад лекцый некаторых выкладчыкаў сваёй глыбокай навуковасьцю і вобразнасьцю. Перад ім не ляжаў пажоўклы канспект. У руках была толькі невялічкая паперка з лічбамі, але часта і ў яе ён не заглядаў. Прывяду адзін вобразны выраз з яго лекцыі. Так, распавядаючы пра шляхі зносін у гарах Паміра і Цянь-Шаня ён гаварыў: " Ідучы па горнай сцяжынцы на скалах можна бачыць такія надпісы "Спадарожнікі, памятай, што ты тут як, сляза на вейку". Адзін неасцяропжны крок і ты паляціш у бездань. Вясной 1962 года яго прызначылі рэктарам Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі. Мы адправілі цэлую дэлегацыю да Івана Іванавіча, каб ён дачытаў нам курс лекцый. Нягледзячы на занятасць, ён прыходзіў да нас і дачытваў курс.

Пасля заканчэння аспірантуры мне неабходна было знайсці месца працы. У той час Іван Іванавіч узначальваў Навукова Даследчы Інстытут Эканомікі і Эканоміка-Матэматычных Метадаў Планавання пры Дзяржплане БССР. Я звярнуўся да яго і атрымаў запрашэшше на працу. Дарэчы, дзякуючы яму, амаль палова супрацоўнікаў інстытута былі выпускнікамі геаграфічнага факультэта і вучнямі Івана Іванавіча. Ён ведаў іх яшчэ ў перыяд вучобы і адбіраў найлепшых. І яны дастойна працавалі, не падводзячы свайго настаўніка.

Іван Іванавіч быў чалавекам непаказной маральнасці, прынцыповасці. Для яго была важна сапраўдная творчая праца, а не паказная шуміха. Ён быў строгім і патрабавальным не толькі ў адносінах да тых, з кім ён працаваў, але і да сябе. Гэта была творчая асоба, чалавек з вялікай літары, асоба свайго часу. Іван Іванавіч Трухан быў сапраўдны народны інтэлегент, які так шмат зрабіў для развіцця геаграфічнай адукацыіі і навукі у Беларусі. Такія асобы з'яўляюцца не так часта на нашай Зямлі.